**УДК 392.1(476.2-37Жыткавічы)**

***А. М. Рэшанок***

# ЛАКАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ РАДЗІННА-ХРЭСЬБІННАЙ АБРАДНАСЦІ ЖЫТКАВІЦКАГА РАЁНА

*У дадзеным артыкуле на багатым архіўным матэрыяле разглядаецца мясцовая спецыфіка радзінна-хрэсьбіннай абраднасці Жыткавіцкага раёна. Аўтар засяроджвае ўвагу на асобных структурных кампанентах і звязаных з імі міфалагічных уяўленнях, прыводзіць канкрэтныя прыклады прыкмет і павер'яў, звязаных з цяжарнасцю жанчыны і нараджэннем дзіцяці.*

Галоўным прыярытэтам у жыцці беларусаў з даўніх часоў была сям'я, якая не лічылася поўнай, калі ў ёй не было дзіцяці. Невыпадкова да выканання рытуалаў радзінна-хрэсьбіннага абрадавага комплексу беларусы ставіліся вельмі сур'ёзна і адказна. Калі гаварыць пра яго мясцовую структуру, то асноўныя кампаненты з'яўляюцца традыцыйнымі і маюць агульнаэтнічную аснову.

Як адзначаюць даследчыкі, сярод структурных кампанентаў вылучаюцца наступныя: прыкметы і павер'і, звязаныя з цяжарнасцю жанчыны, выбар кума і кумы, падрыхтоўка бабкай-павітухай абрадавай стравы – кашы, абрад хрышчэння дзіцяці, хрэсьбіннае застолле, абрад разбівання гаршка з кашай, дзяльба кашы, рытуалы ўшанавання бабкі-павітухі, адорванне падарункамі бабкі і жанчыны-парадзіхі.

Значнае месца ў сістэме радзінна-хрэсьбіннай абраднасці займалі прыкметы і павер'і, звязаныя з цяжарнасцю жанчыны, якія імкнуліся прытрымлівацца ў гэты перыяд народных вераванняў і агульнапрынятых правіл, што магло паўплываць на здароўе і шчасце нованароджанага. Паводле меркаванняў даследчыка А. Фядосіка, "без перабольшвання можна сцвярджаць, што ва ўсіх народаў свету існавалі пэўныя традыцыйныя правілы, забароны і засцярогі паводзін цяжарнай жанчыны, якія павінны былі аблегчыць роды, садзейнічаць здароўю і шчасцю нованароджанага ў будучым. Але ў розных народаў гэтыя правілы і засцярогі былі ў значнай частцы адметныя, часам нават мелі неаднолькавы семантычны сэнс пры падобных дзеяннях" [1, с. 26]. Звернем увагу на канкрэтныя запісы прыкмет і павер'яў у вёсках Жыткавіцкага раёна. Як адзначыла Надзея Юр'еўна Шапавалава, 1933 г. н. з в. Азяраны, каб аблегчыць пакуты жанчыны-парадзіхі, трэба было *"зняць у дзяжы абруч і надзець яго тры разы на парадзіху зверху ўніз"* [2, с. 221]. Паводле сведчанняў жыхароў в. Рычоў, цяжарным жанчынам забаранялася пераступаць праз вяроўку, стаяць на парозе, пазычаць што-небудзь: *"Даўней існавалі вераванні, звязаныя з цяжарнасцю жанчыны. Цяжарнай жанчыне забаранялася: пераступаць вяроўку, бо пры нараджэнні пупавіна перадушыць дзіця, вакол горла абаўецца; стаяць на парозе хаты, бо будуць цяжкія і працяглыя роды; прасіць у доўг, бо тое, што папросіш, з'ядуць мышы; працаваць, асабліва ў святы; хадзіць на могілкі ці на пахараны, бо дзіця народзіцца жоўтае"* (Запісана ў в. Рычоў ад Рыдзецкай Г. М., 1932 г. н.) [2, с. 225]. Асцерагаліся цяжарныя жанчыны, калі спалохаюцца, дакранацца да якіх-небудзь частак свайго цела, класці вымытую бялізну сабе на плечы, хадзіць на могілкі, выглядваць праз акно на вуліцу, па якой везлі хаваць нябожчыка: *"Як бярэменная, то калі спужаесса, то не трэба хватацца за цело, бо дзіця будзе покрытэ пятнамі. Нельзя лезці ў жэрдзіны. Нельзя, як сціраеш, класці одзежу выкручаную на плечы, штоб пупавіна не завезаласа на шыі дзіцяці. Нельзя на кладбішчы ходзіць, бо можэ зробіцца плохо, дзіця можэ родзіцца з жоўтою кожэю, бу ў мертвеца. Нельзя гледзець у вокно, як везуць покойніка"* (Запісана ў в. Пухавічы ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г. н.) [2, с. 227].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Вядома, што даўней трымалі ў таямніцы месца нараджэння дзіцяці, што таксама пацвярджаецца фактычнымі матэрыяламі: *"Роды адбываліся ў хаце ці нейкай гаспадарчай пабудове. Цяжарная жанчына павінна была абысці вакол таго месца, дзе будзе ражаць, чытаючы пры гэтым малітву"* (Запісана ў в. Рычоў ад Рыдзецкай Г. М., 1932 г. н.) [2, с. 225]. Паводле сведчанняў некаторых мясцовых жыхароў, іншы раз роды адбываліся дома: *"Калі ражала жэншчына, то звалі бабку-повітуху і роды прынімалі дома"* (Запісана ў в. Пухавічы ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г. н.) [2, с. 228].

Важную ролю падчас родаў жанчыны-парадзіхі выконвала бабка-павітуха, прысутнасць якой была абавязковай, што пацвярджаюць жыхары в. Азяраны. Як правіла, гэта развязванне вузлоў і паясоў, расплятанне касы, адкрыванне замкоў, "абход з жанчынай-парадзіхай вакол стала і праз ганак" і інш.: *"Павітуха дапамагала парадзісе як магла. Акрамя чыста акушэрскіх прыёмаў, яна выконвала шэраг магічных дзеянняў, заснаваных на веры ў звышнатуральныя сілы. На парадзісе расшпілялі ўсе гузікі, развязвалі вузлы, паясы, расплятaлі косы, адкрывалі ўсе замкі, дзверы, куфры ў хаце. Бабка шаптала замовы, пастуквала венікам у столь, як бы звяртаючыся за дапамогай да дамавіка. Вадзіла парадзіху тры разы вакол стала і праз ганак, якія лічыліся свяшчэннымі месцамі хаты..."* (Запісана ў в. Азяраны ад Шапавалавай Надзеі Юр'еўны, 1933 г. н.) [2, с. 221]. Каб забяспечыць у будучым багацце дзіцяці, *"павітуха ніколі не прымала дзіця голымі рукамі, а накрывала іх якім-небудзь старым адзеннем, каб у будучым дзіця жыло ў багацці. Часам жартам павітуха загортвала хлопчыка ў жаночую сарочку, каб яго, як падрасце, любілі дзяўчаты"* (Запісана ў в. Азяраны ад Шапавалавай Надзеі Юр'еўны, 1933 г. н.) [2, с. 221]. Варта адзначыць, што ў некаторых вёсках падчас нараджэння дзіцяці павінен быў прысутнічаць і муж: *"У час родаў павінны былі прысутнічаць муж і баба-павітуха"* (Запісана ў в. Рычоў ад Рыдзецкай Г. М., 1932 г. н.) [2, с. 225].

Бабка-павітуха, зыходзячы з успамінаў жыхароў в. Пухавічы, выконвала важную функцыю – павінна была пакупаць нованароджанага. Адзначым, што семантыка рытуалу купання дзіцяці бабкай-павітухай мела адметны мясцовы характар: *"На другі дзень баба-повітуха прыходзіла муць дзіцятко, ужэ наварыць горшчык компоту да прынясе ўнуццы. Обмуваць обезацельно трэба було, потому што это шчытаецца, як бу ты его вубросіла на двор, но Бог его пудыме, і ён его сам обмуе. А сомой обмуваць нельзя. А еслі ты не обмула его, то это, шчытай, як ты яго вубросіла на поле"* (Запісана ў в. Пухавічы ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г. н.) [2, с. 228].

У абрадзе хрышчэння дзіцяці прымалі ўдзел кум і кума, а бацькам нованароджанага знаходзіцца ў гэты час у царкве забаранялася: *"Важным было хрышчэнне – абарона дзіцяці ад нячыстай сілы. Звычайна кума выбірала кума. Таксама на хрысціны дзіцяці выбіралі хросную бабу. Абрад хрышчэння дзіцяці адбываўся ў цэркві. На хрышчэнне дзіцяці ехалі кум і кума. Маці і бацьку ехаць забаранялася. Пры хрышчэнні першым павінен прымаць дзіця кум і толькі пасля яго прымала кума. Спачатку дзіця ў цэркві мылі свяцонай вадой, а затым яго падстрыгалі. Абрад хрышчэння заканчваўся хрэсьбінамі, якія праводзіліся звычайна ў той хаце, дзе жыве дзіця. У хаце збіраліся родныя, суседзі"* (Запісана ў в. Рычоў ад Рыдзецкай Г. М., 1932 г. н.) [2, с. 225]; *"Колісь да царквы ішлі пешку альбо ехалі на конях. У царкве праходзіў абрад хрышчэння дзіцяці. Хросная маці на працягу ўсяго абрада трымала дзіця на сваіх руках. Той мятлік, што брала хросная з сабою, патрэбен толькі ў царкве. Калі дзіця хрысцілі і аблівалі свячонай вадою, мятлікам выціралі і аддавалі маці дзіцяці, каб тая абавяз-кова адзявала яго на дзіця. За хрышчэнне дзіцяці плаціў грошы хросны бацька і купляў крэшчык. Калі вярталіся з царквы, то ў хаце гаспадароў чакалі астатнія госці. За стол і на покуць садзілі бабку-павітуху, а за ёй кумаўя*" (Запісана ў в. Дзякавічы ад Рагалевіч Вольгі Сяргееўны, 1936 г. н., Рагалевіч Кацярыны Аляксееўны, 1934 г. н.) [2, с. 222].

Цэнтральным момантам радзінна-хрэсьбіннай абраднасці Жыткавіцкага раёна з'яўляецца абрад разбівання гаршчка з кашай. Звычайна гэты пачэсны абавязак выконваў той, хто пакладзе больш грошай "на кашу": *"У концы застолля падавалі*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*кашу. Кашу варыла бабка-павітуха з пшана ў гліняным гаршку. Кашу перакупалі. Наіболей даваў грошай кум (хросны бацька дзіцяці). Хто болей даў грошай, той і кашу дзяліў. Гаршок з кашай разбівалі аб стол. Раздаваў усім удзельнікам перакупу па куску кашы. Грошы аддаваліся парадзелі"* (Запісана ў в. Запясочча ад Русай Ганны Іванаўны) [2, с. 223]. Выклікаюць цікавасць звесткі пра абрад разбівання гаршчка з кашай у в. Дзякавічы, дзе важная роля ў гэтай цырымоніі адводзілася выбару так званага "лічыльніка", чалавека, які вёў падлік пакладзеных гасцямі грошай, каб выкупіць гаршчок з бабінай кашай: *"Самым галоўным у гэтым застоллі была бабіна каша. Перад тым, як разбіць горшчык з бабінай кашай, яе патрэбна было выкупіць. Выбіралі сярод прысутных самага гаварлівага і жартаўлівага чалавека, які быў лічыльнікам (лічыў, на якую суму пакладзе на горшчык з кашай кум, кума, баба). Клалі на горшчык не ўсё сразу, а паступова, а лічыльнік лічыў. Заўжды рабілі на канцы так, каб каша была кумава. І ён разбіваў гаршок з бабінай кашай. Лічыльнік назначаў суму за бабіну кашу і абавязкова плацілі бабі за яе кашу"* (Запісана ў в. Дзякавічы ад Рагалевіч Вольгі Сяргееўны, 1936 г. н., Рагалевіч Кацярыны Аляксееўны, 1934 г. н.) [2, с. 222]. Магічнае значэнне надавалі чарапкам ад разбітага гаршчка, якія або раздавалі ўсім тым прысутным, у каго не было дзяцей, або "кідалі ў падол" маладым дзяўчатам, каб забяспечыць у будучым нараджэнне дзіцяці, або клалі на галаву незамужняй куме, каб выйшла ў гэтым годзе замуж: *"Была каша, звараная бабай. Кашу ставілі на стол і куплялі яе, лажылі грошы, падаркі. У гэтым торзе патрэбна, каб перамог кум. Хто переможа ў грошах, той і б'е кашу. Калі білі гаршок, гаварылі: "Дзе чарапкі б'юцца, там дзеці вядуцца. Пасля гэтага раздавалі чарапкі тым, у каго не было дзяцей"* (Запісана ў в. Рычоў ад Рыдзецкай Г. М., 1932 г. н.) [2, с. 225]; *"Разбітыя кавалачкі горшчыка кідалі на падол маладым маладзіцам, каб у тых таксама скора былі радзіны"* (Запісана ў в. Дзякавічы ад Рагалевіч Вольгі Сяргееўны, 1936 г. н., Рагалевіч Кацярыны Аляксееўны, 1934 г. н.) [2, с. 222]; *"Білі горшчык, і чэрэпкі клалі куме на галову. Калі яна была незамужняя, то яна ў той год пойдзе замуж"* (Запісана у в. Пухавічы ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г. н.) [2, с. 228].

Прыведзеныя матэрыялы па радзінна-хрэсьбіннай абраднасці Жыткавіцкага раёна сведчаць пра важнасць рытуалаў, звязаных з нараджэннем і хрышчэннем дзіцяці, а таксама пра вялікую ролю прыкмет і павер'яў, якіх прытрымліваліся даўней і ўлічваюць іх мясцовыя жыхары ў сваім жыцці і побыце і сёння.

**Літаратура**

1 Фядосік, А. С. Беларуская сямейна-абрадавая паэзія / А. С. Фядосік / навук. рэд. А. С. Ліс. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1997. – 126 с.

2 Радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі беларусаў (на матэрыяле фальклору Гомельскай вобласці) / аўтары-ўкладальнікі В. С. Новак, В. К. Шынкарэнка, А. А. Кастрыца, А. М. Воінава, С. А. Вяргеенка, А. М. Палуян, А. У. Партнова-Шахоўская. – Гомель : Барк, 2013. – 380 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**УДК 811.111'42:811.161.1'42**

***Е. Д. Смотрицкая***

## НАЦИОНАЛЬНО-КУЛЬТУРНАЯ СПЕЦИФИКА АНГЛОЯЗЫЧНОГО И РУССКОЯЗЫЧНОГО ПУБЛИЦИСТИЧЕСКОГО ДИСКУРСА

*В статье проводится сравнительно-сопоставительный анализ англоязычного и русскоязычного публицистического дискурса на материале выступлений и обращений*